КРУПА — «УГАРУ», АДЗЕННЕ — З МЕНШАЙ СТАЎКАЙ

АДЗІНЫЯ ўмовы перамяшчэння тавараў для асабістага карыстання ў рамках Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана павінны быць вызначаныя на працягу першай паловы 2010 года — аб гэтым паведаміў начальнік прававога ўпраўлення Дзяржаўнага мытнага камітэта нашай краіны Аляксандр Адзярэйка. Прычым пакуль правілы тут сапраўды розныя. Варта нагадаць, што цяпер на тэрыторыю Беларусі без мытнай пошліны можна ўвезці тавары для асабістага карыстання коштам не больш за 1000 еўра і вагой не больш за 35 кілаграмаў. Прыкладна такія ж нормы дзейнічаюць у Расіі. А вось «гранічная планка» ў Казахстане — значна вышэйшая.

ДЛЯ ФІЗІЧНЫХ — ПАД ПЫТАННЕМ

З 1 студзеня мытныя пошліны павышаюцца адразу на некалькі групаў тавараў. Найбольш адметнымі пазіцыямі для айчыннай эканомікі тут можна назваць сіласаўборачныя і збожжаўборачныя камбайны, найбольш адчувальнымі напрамкамі непасрэдна для грамадзян — малако і малочную прадукцыю, крупы (у тым ліку рыс), гатовыя прадукты з мяса, вырабы з паперы, а таксама аўтамабілі.

Як заўважыў начальнік упраўлення тарыфнага рэгулявання і мытных плацяжоў ДМК Сяргей Полудзень, самы істотны рост ставак (па асобных катэгорыях аўто — нават у 7—10 разоў) усё ж датычыцца транспартных сродкаў ва ўзросце больш за 5 гадоў. Рост па транспартных сродках ва ўзросце да 3 і ад 3 да 5 гадоў будзе меншым.

Да таго ж нялішне адзначыць: пакуль новыя стаўкі дзейнічаюць толькі ў дачыненні да юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў. Пытанне са стаўкамі для фізічных асобаў плануецца вырашыць на працягу першай паловы года. У гэты ж тэрмін ёсць намер вызначыцца і з правіламі па каштоўных камянях і каштоўных металах.

Дарэчы, таксама на працягу першай паловы года мяркуецца вызначыцца па пытаннях свабодных і асаблівых эканамічных зонаў, свабодных мытных складоў, прыцягнення да адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці за парушэнне мытнага заканадаўства, па аб'ектах інтэлектуальнай уласнасці, парадку вылічэння і размеркавання ўвазных пошлін, а плюс да таго — падпісаць пагадненні аб перамяшчэнні тавараў трубаправодным транспартам і па лініях электрапередач.

З ТУРЦЫІ СА ЗНІЖКАЙ?

Але вынік Мытнага саюза — не толькі рост ставак. Па некаторых пазіцыях яны наадварот зменшаюцца. Напрыклад, зніжэнне датычыцца такіх тавараў, як трапічная садавіна, адзенне і абутак.

Апроч таго, на цэны можа паўплываць і наступная акалічнасць. Як падкрэсліў Сяргей Полудзень, у рамках Мытнага саюза пачынае дзейнічаць сістэма тарыфных прэферэнцый у дачыненні да найменш развітых краін і краін, якія развіваюцца. Пры выкананні ўмоў увозу і «паходжання» тавараў мытная стаўка пры гандлі з найменш развітымі краінамі можа не выплачвацца ўвогуле. А па таварах з краін, якія развіваюцца, стаўка змяншаецца на 25 працэнтаў. Прычым нялішне зазначыць, што да катэгорыі тых краін, якія развіваюцца, належаць у тым ліку Албанія, Турцыя, Боснія і Герцагавіна, Чарнагорыя і Харватыя.

АБМЕЖАВАННІ СКАРАЧАЮЦЦА

Тым часам, паведаміў начальнік упраўлення арганізацыі мытнага кантролю ДМК Мікалай Бурш, у сувязі са стварэннем Мытнага саюза пачынаюць дзейнічаць новыя нормы па забаронах і абмежаваннях перамяшчэння асобных катэгорый тавараў. Так, істотна скарачаецца пералік тавараў, абмежаваных для перамяшчэння праз мяжу на эканамічных падставах. Абмежаванні застануцца толькі пры экспарце ўгнаенняў, пры імпарце алкагольнай прадукцыі, тытунёвай сыравіны і вырабаў, рыбы і морапрадуктаў, а таксама прадуктаў іх перапрацоўкі.

Плюс да таго, захаваюцца квоты пры экспарце адходаў чорных і каляровых металаў, ліцэнзаванне экспарту нафты і нафтапрадуктаў. Пры гэтым скасоўваецца ліцэнзаванне на экспарт тэкстыльнай прадукцыі і ўводзіцца тарыфная квота на імпарт мяса свініны. Чакаецца, што аб'ём гэтай квоты складзе 300 тыс. тон, а яе размеркаваннем зоймецца Мінсельгасхарч.

Сяргей ГРЫБ.

Падарунак ад альпійскага Дзеда Мароза

Сапраўднае навагодняе свята падарылі сваім прыхільнікам хакеісты мінскага «Дынама». У апошнія дні 2009 года «бела-блакітныя» ў швейцарскім Давосе перамаглі ў адным з самых прэстыжных клубных турніраў Старога свету — «Кубку Шпэнглера», а ў чэмпіянаце КХЛ у гасцях «на нуль» абгулялі «Сібір».

Шлях да гэтага выніку быў не вельмі лёгкі. Як мы ўжо паведамлялі, саступіўшы ў першай гульні гаспадарам, мінчане на наступны дзень абгулялі прадстаўнікоў германскага «Мангейма» і пасля суткі адпачывалі. Гэты час стаў сапраўднай жывой вадой для нашай каманды. Бо прайшло ўсяго тры хвіліны і дванаццаць секундаў з пачатку паядынку з чэшскай «Энергіяй», а на табло ўжо гарэлі лічбы 4:0 на карысць беларусаў. Двойчы адзначыўся Дзмітрый Мялешка, па адным разе Хювенен і Чупрыс. Чэшскай камандзе не дапамог нават Зігмунд Палфі, які выступаў на турніры за іх, і мае шматгадовы вопыт НХЛ. За другі і трэці перыяды шайба яшчэ чатыры разы ўскалыхнула сетку варот суперніка: дубль аформіў Хювенен, з далёкай дыстанцыі адзначыліся абаронцы Антонаў і Уэскат, а кропку пасля прыгожых лічбаў «8:0» паставіў Кулакоў.

Пасля такой феерыі Аляксандр Андрыеўскі ўсё ж змяніў склад перад гульнёй са зборнай Канады, даўшы адпачыць Мезіну і Хювенену. У такой сітуацыі ролю лідараў на сябе ўзяла тройка Чупрыс-Варламаў-Качаткоў, на рахунку якой тры ўзяцці варот сааамерыканцаў. Але канадцы не былі б канадцамі, калі б не змагаліся да апошніх секундаў. Прабіць аднак Коваля больш разоў, чым прапусцілі самі, не змаглі. Перамога — і выхад у фінал, у якім беларусаў чакаў новы-стары супернік — мясцовы «Давос». Але калі пры першым іх спатканні швейцарцам шанцавала закідваць зусім «нерэальныя» шайбы (і рыкашэты, і памылкі нашых абаронцаў, і незразумелыя рашэнні арбітраў — чаго там толькі ні было!), то цяпер усё вырашылася толькі па-хакейнаму. «Зубры», як мы ўжо звыкліся бачыць, распачалі хутка і небяспечна для суперніка. І такая тактыка прынесла свой плён, на дзявятай хвіліне сваю другую шайбу на турніры закінуў Кулакоў. А на пачатку другой дваццаціхвілінкі вызначыўся Качаткоў, выбіўшыся з трыма галамі ў лепшыя бамбардзіры «Дынама» на «Кубку Шпэнглера». Гаспадары змаглі адказаць толькі шайбай Колніка, прапусціўшы пры тым на апошніх секундах трэцюю шайбу.

Беларуская каманда стала дваццаць восьмым уладальнікам прэстыжнага кубка. Праўда, сам галоўны прыз у Мінск пакуль не даехаў. Пасля фінальнага паядынку ён выпаў з рук капітана Вілі Пелтанена і разбіўся. Новую кампанію арганізатары абяцалі падрыхтаваць да матча зорак КХЛ, які, нагадаем, адбудзецца 30 студзеня на пляцоўцы «Мінск-Арэны».

Пасля перапынку ў чэмпіянаце КХЛ «зубры» адразу пасля Швейцарыі адправіліся ў Новасібірск. Мясцовая «Сібір» — каманда не зорная, але і не вельмі прыемная, можна сказаць — калючая. Калі ў некалькіх словах пра падзеі паядынку, то галоўнае — гэта тое, што нашы вельмі надзейна згулялі ў абароне. Асабліва вылучаўся Дзянісаў, які не раз «прыштампоўваў» супернікаў да бортаў, адсюль і першая перамога «на ноль» у выкананні Віталя Коваля і ўсёй каманды. Ну а ў нападзенні прачнуўся Джэф Плат, які даў сабе трошкі адпачыць (у сэнсе закінутых шайбаў) падчас «Кубка Шпэнглера». Яго кідкі на другой і дзявятай хвілінах першага перыяду пасля перадач фінаў Пелтанена і Ёкелы сталі невырашальнай задачай для канадскага галкіпера новасібірцаў Лоўсана. Гэтая перамога важная яшчэ і тым, што адбылася на фоне паражэння рыжскіх дынамаўцаў ад навакузнецкага «Металурга», што наблізіла беларускую каманду да зоны плэй-оф.

Яўген ВАРАКСА,
фота hcdinamo.by

Зацвярджаю
Старшыня Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь
А.Л. ЗІМОЎСКІ
«24» XII 2009 г.

ПАЛАЖЭННЕ
аб правядзенні нацыянальнага адборачнага тура конкурсу маладых музыкантаў «Еўрабачанне-2010»

РАЗДЗЕЛ I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Гэтае Палажэнне вызначае парадак правядзення нацыянальнага адборачнага тура (далей — рэспубліканскі конкурс) конкурсу маладых музыкантаў «Еўрабачанне-2010» (далей — міжнародны конкурс), заснаванага Еўрапейскім Вяшчальным Саюзам (далей — ЕВС) у 1982 годзе, які адбудзецца ў маі 2010 года і адкрыве Венскі фестываль мастацтваў.

2. Арганізатарам рэспубліканскага конкурсу з'яўляецца Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскі конкурс праводзіцца пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

3. Рэспубліканскі конкурс праводзіцца ў адпаведнасці з гэтым Палажэннем і Правіламі міжнароднага конкурсу, якія вызначаюцца ЕВС, умовы якіх з'яўляюцца неад'емнымі і абавязковымі пры правядзенні рэспубліканскага конкурсу, у тым ліку ў частцы патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да канкурсантаў музычных твораў, працэдуры нацыянальнага адбору, а таксама гарантый перадачы сумежных правоў.

4. Афіцыйным друкаваным выданнем для размяшчэння інфармацыі аб рэспубліканскім конкурсе з'яўляецца газета «Звязда». Інфармацыя аб рэспубліканскім конкурсе размяшчаецца таксама на афіцыйным сайце Арганізатара рэспубліканскага конкурсу: www.tvr.by.

РАЗДЗЕЛ II. ПРАВІЛЫ ЎДЗЕЛУ І ПРАЦЭДУРА ПАДАЧЫ ЗАЯВАК

Глава 1. Патрабаванні, якія прад'яўляюцца да канкурсантаў

5. Да ўдзелу ў рэспубліканскім конкурсе дапускаюцца канкурсанты:

якім у 2010 годзе не павінна споўніцца 20 або больш гадоў (народжаныя пасля 1 студзеня 1991 года ўключна, мінімальны ўзрост не вызначаецца);

якія з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь або замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь не менш за два гады;

якія з'яўляюцца сольнымі выканаўцамі (дуэты, трыа, квартэты і іншыя калектывы выключаюцца);

якія валодаюць любым музычным інструментам, для якога існуюць напісаныя партыі для сольнага выканання ў суправаджэнні аркестра;

агульная працягласць рэпертуару якіх для сольнага выканання або выканання з акампаніятарам-піяністам складае мінімум 15 хвілін, для сольнага выканання ў суправаджэнні аркестра — мінімум 7 хвілін 30 секундаў.

Глава 2. Працэдура падачы заявак

6. Для ўдзелу ў рэспубліканскім конкурсе (пры ўмове выканання патрабаванняў Главы I гэтага Раздзела) неабходна падаць заяўку, якая складаецца з:

цалкам запоўненай анкеты (Дадатак 1 да гэтага Палажэння);

заявы законнага прадстаўніка канкурсанта (Дадатак 2 да гэтага Палажэння) у выпадку, калі канкурсанту менш за 18 гадоў;

ксеракопіі пасведчання аб нараджэнні або пашпарта канкурсанта;

даведкі з месца вучобы канкурсанта (музычная навучальная ўстанова);

характарыстыкі, выдадзенай канкурсанту педагогам па спецыяльнасці і засведчанай кіраўніком адпаведнай музычнай навучальнай установы;

фатаграфіі канкурсанта.

7. Заяўка накіроўваецца заказным лістом на адрас: 220807, г. Мінск, вул. Макаёнка, 9, з паметкай «На нацыянальны адборачны тур конкурсу маладых музыкантаў «Еўрабачанне-2010».

Апошні дзень адпраўкі заказных лістоў з заяўкамі — 1 лютага 2010 г.

Дата адпраўкі вызначаецца па паштовым штэмпелі. Улік прынятых заявак вядзецца ў журнале ўліку заявак на ўдзел у рэспубліканскім конкурсе ў парадку, які вызначаецца Арганізатарам рэспубліканскага конкурсу.

8. Дасланыя на рэспубліканскі конкурс матэрыялы не вяртаюцца.

9. Да ўдзелу ў рэспубліканскім конкурсе дапускаюцца заяўкі, якія строга адпавядаюць патрабаванням гэтага Палажэння.

10. Расходы, звязаныя з удзелам у рэспубліканскім конкурсе (паслугі пошты, праезд, пражыванне і іншыя), аплачваюцца канкурсантамі самастойна.

РАЗДЗЕЛ III. ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ РЭСПУБЛІКАНСКАГА КОНКУРСУ

Глава 1. Агульныя палажэнні

11. Рэспубліканскі конкурс складаецца з наступных этапаў:

адборачны тур, праслухоўванне і фінал. Па выніках праслухоўвання Арганізатар рэспубліканскага конкурсу мае права прыняць рашэнне аб правядзенні дадатковага этапа — паўфіналу — і вызначыць парадак яго правядзення. Фармат праслухоўвання і фіналу (а таксама паўфіналу, у выпадку яго правядзення) вызначаецца Арганізатарам рэспубліканскага конкурсу.

12. Для падвядзення вынікаў рэспубліканскага конкурсу Арганізатар рэспубліканскага конкурсу стварае прафесійнае журы і вызначае парадак яго працы.

Глава 2. Адборачны тур

13. Заяўкі на ўдзел у рэспубліканскім конкурсе разглядаюцца прафесійным журы ў тэрмін да 15 лютага 2010 года.

14. Па выніках разгляду заявак прафесійнае журы праводзіць адбор канкурсантаў для праслухоўвання.

15. Арганізатар паведамляе канкурсантам, адабраным у адпаведнасці з пунктам 14 гэтага Палажэння, пра дату, час і месца правядзення праслухоўвання.

Глава 3. Праслухоўванне

16. Праслухоўванне праводзіцца ў тэрмін да 25 лютага 2010 г.

17. Па выніках праслухоўвання прафесійнае журы ў парадку, вызначаным Арганізатарам рэспубліканскага конкурсу, выбірае канкурсантаў, якія бяруць удзел у фінале рэспубліканскага конкурсу.

18. Канкурсанты, адабраныя для ўдзелу ў фінале рэспубліканскага конкурсу, падпісваюць дагавор (у выпадку, калі канкурсанту менш за 18 гадоў дагавор падпісваецца законным прадстаўніком канкурсанта), распрацаваны Арганізатарам рэспубліканскага конкурсу.

У дагаворы вызначаюцца:

аб'ём правоў, якія перадаюцца Арганізатару рэспубліканскага конкурсу і ЕВС, на выкарыстанне выступлення канкурсанта ў рэспубліканскім конкурсе, міжнародным конкурсе (у выпадку перамогі канкурсанта ў рэспубліканскім конкурсе), у аўдыёвізуальных творах, якія ствараюцца ў сувязі з правядзеннем рэспубліканскага і/або міжнароднага конкурсу;

парадак падрыхтоўкі канкурсанта да ўдзелу ў міжнародным конкурсе ў выпадку перамогі канкурсанта ў рэспубліканскім конкурсе, правы і абавязкі канкурсанта і Арганізатара рэспубліканскага конкурсу, уключаючы абавязак канкурсанта замяніць замоўлены для ўдзелу ў міжнародным конкурсе музычны твор у выпадку адпаведнага патрабавання ЕВС, штрафныя санкцыі за парушэнне ўмоў гэтага дагавора;

іншыя ўмовы ўдзелу канкурсанта ў рэспубліканскім конкурсе, міжнародным конкурсе (у выпадку перамогі канкурсанта ў рэспубліканскім конкурсе).

Падпісанне дагавора, названага ў гэтым пункце, з'яўляецца абавязковай умовай удзелу кожнага канкурсанта ў фінале рэспубліканскага конкурсу.

Глава 4. Фінал

19. Фінал рэспубліканскага конкурсу праводзіцца ў лютым—сакавіку 2010 г. Пераможца рэспубліканскага конкурсу вызначаецца па выніках галасавання прафесійнага журы.

РАЗДЗЕЛ IV. УЗНАГАРОДЖАННЕ ФІНАЛІСТАЎ І ПЕРАМОЖЦАЎ РЭСПУБЛІКАНСКАГА КОНКУРСУ

20. Для ўзнагароджання фіналістаў і пераможцаў рэспубліканскага конкурсу Арганізатарам рэспубліканскага конкурсу ствараецца прызавы фонд.

21. Усім фіналістам і пераможцу рэспубліканскага конкурсу прысвойваецца званне дыпламантаў рэспубліканскага конкурсу, уручаюцца адпаведныя дыпломы і прызы.

РАЗДЗЕЛ V. САДЗЕЙНІЧАННЕ, ЯКОЕ АКАЗВАЕЦЦА КАНКУРСАНТАМ АРГАНІЗАТАРАМ РЭСПУБЛІКАНСКАГА КОНКУРСУ

22. З мэтай забеспячэння роўных умоў для канкурсантаў, якія бяруць удзел у рэспубліканскім конкурсе, Арганізатар рэспубліканскага конкурсу ў аб'ёме і на ўмовах, якія ім вызначаюцца, мае права аплаціць частку расходаў, звязаных з удзелам канкурсантаў у рэспубліканскім конкурсе.

РАЗДЗЕЛ VI. ДЫСКВАЛІФІКАЦЫЯ

23. У выпадку парушэння якім-небудзь канкурсантам і (або) яго законным прадстаўніком (у выпадку, калі канкурсанту менш за 18 гадоў) гэтага Палажэння, Правілаў міжнароднага конкурсу, Арганізатар рэспубліканскага конкурсу мае права прыняць рашэнне аб дыскваліфікацыі гэтага канкурсанта і адхілення ад удзелу ў рэспубліканскім конкурсе.

РАЗДЗЕЛ VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

24. Усе правы, якія адносяцца да правядзення рэспубліканскага конкурсу, належаць выключна Арганізатару рэспубліканскага конкурсу.

25. Гэтае Палажэнне і Правілы міжнароднага конкурсу з'яўляюцца абавязковымі для канкурсантаў, якія падалі заяўку на ўдзел у рэспубліканскім конкурсе, а таксама для канкурсанта, які стаў пераможцам рэспубліканскага конкурсу.

26. Арганізатар рэспубліканскага конкурсу можа прыняць да разгляду любое пытанне, звязанае з правядзеннем рэспубліканскага конкурсу.

Дадатак 1 да Палажэння аб правядзенні нацыянальнага адборачнага тура конкурсу маладых музыкантаў «Еўрабачанне-2010»

АНКЕТА
на ўдзел у нацыянальным адборачным туры конкурсу маладых музыкантаў «Еўрабачанне-2010»

1. Прозвішча канкурсанта: _____
2. Імя канкурсанта: _____
3. Імя па бацьку канкурсанта: _____
4. Дата нараджэння канкурсанта: _____
5. Месца нараджэння канкурсанта: _____
6. Грамадзянства канкурсанта: _____
7. Месца (ы) вучобы канкурсанта: _____
8. Кантактныя тэлефоны (мабільны, хатні, працоўны) канкурсанта: або (калі канкурсанту менш за 18 гадоў) законнага (ых) прадстаўніка (оў) канкурсанта: _____
9. Адрас электроннай пошты (e-mail канкурсанта або (калі канкурсанту менш за 18 гадоў) законнага (ых) прадстаўніка (оў) канкурсанта: _____
10. Адрас для паштовых адпраўленняў канкурсанту з пазначэннем паштовага індэкса: _____
11. Музычны інструмент, якім валодае канкурсант: _____
12. Інфармацыя аб рэпертуары канкурсанта для сольнага выканання або выканання з акампаніятарам-піяністам з пазначэннем назвы, аўтара, працягласці кожнага твора: _____
13. Інфармацыя аб рэпертуары канкурсанта для сольнага выканання ў суправаджэнні аркестра з пазначэннем назвы, аўтара, хронаметражу кожнага твора: _____
14. Інфармацыя аб удзеле канкурсанта ў музычных конкурсах, фестывалях, тэле- і радыёпраектах (пазначыць назву, краіну, год, месца, якое заняў канкурсант, дадаць копіі адпаведных дыпломаў, калі яны ёсць): _____

З Палажэннем аб правядзенні нацыянальнага адборачнага тура конкурсу маладых музыкантаў «Еўрабачанне-2010» азнаёмлены(а), згодны(а), абавязваюся яго выконваць.

Дата запаўнення анкеты: _____

Подпіс канкурсанта або, калі канкурсанту менш за 18 гадоў, законнага прадстаўніка канкурсанта з расшыфроўкай:

Дадатак 2 да Палажэння аб правядзенні нацыянальнага адборачнага тура конкурсу маладых музыкантаў «Еўрабачанне-2010»

Заява

Я, _____
(Прозвішча, імя, імя па бацьку законнага прадстаўніка канкурсанта),
гэтым выказваю згоду на ўдзел сына/дачкі ў нацыянальным адборачным туры конкурсу маладых музыкантаў «Еўрабачанне-2010», а ў выпадку перамогі — у конкурсе маладых музыкантаў «Еўрабачанне-2010».

Дата: _____

Подпіс законнага прадстаўніка канкурсанта з расшыфроўкай: _____

СЕМЕЖАЎСКІЯ «ЦАРЫ»

Адзіны ў Беларусі народны абрад «Цары», які бытаваў у мінулым, а цяпер і цалкам адроджаны ў вёсцы Семежава Капыльскага раёна і з'яўляецца жывой традыцыяй, дзякуючы намаганням работнікаў культуры і навукоўцаў-фалькларыстаў атрымаў сёлета дзяржаўны ахоўны статус як сусветная нематэрыяльная каштоўнасць.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Уведомление акционеров ОАО «Жабинковский сахарный завод»

На основании ст. 78 Закона РБ от 09.12.1992 № 2020-XII «О хозяйственных обществах» ОАО «Жабинковский сахарный завод» (далее Общество)

ОБЪЯВЛЯЕТ О ВЫКУПЕ АКЦИЙ СОБСТВЕННОЙ ЭМИССИИ ПО ТРЕБОВАНИЮ АКЦИОНЕРОВ.

Цена выкупа акций — 140 бел. руб. за 1 акцию. Срок предъявления акционерами письменных требований Обществу о выкупе принадлежащих им акций — до 31 января 2010 года. Письменное требование акционера о выкупе принадлежащих ему акций должно содержать фамилию, имя, отчество (наименование), подпись акционера и количество акций, выкупа которых он требует.

УНП 200037600.

КАЛІ ДУША ПАТРАБУЕ ПРАЦЯГУ БАНКЕТУ...

У жыхара вёскі Дубай Столінскага раёна ў першы навагодні дзень скралі з хаты 18 бутэлек спіртных напояў. Хутка затрымалі і злодзея.

Яна СВЕТАВА.

Віншуем любага мужа, бацьку і дзядулю **Іосіфа Станіслававіча ЧАРНЯЎСКАГА з 50-годдзем.**

Аднаго мы просім толькі ў Бога,
Каб вясёлай песняй быў твой лёс,
Каб пражыць гадоў табе так многа,
Колькі зорак на ручніку нябёс.

Жонка, сыны, нявестка, унук, в. Дзераўная.

Паважаны **Іван Іванавіч ПЯТРОВІЧ** з в. Замосце! Прыміце нашы сардэчныя віншаванні з нагоды **65-годдзя з дня нараджэння**. Жадаем здароўя, сямейнага дабрабыту, поспехаў у працы на карысць нашай Радзімы.

З павагай Ачапоўскі В.М., Новік Т.І.

Алу Васільеўну МЕЛЬНІКАВУ віншуем з **юбілеем**! Шчасця вам, поспехаў ва ўсім!

Супрацоўнікі інтэрната № 1 БДТУ.

Віншуем **з 75-гадовым юбілеем і Нараджэннем Хрыстовым дарагога брата Івана Аляксеевіча ЛЫСЮКА** з в. Дубай Столінскага раёна. Здароўя і радасці, марам збыцца і сэрцу доўга біцца.

Брат Мікалай, сястра Вольга і іх сем'і.

Працяг тэмы

«ЦЯПЕР ДАВЯДЗЕЦЦА ЕЗДЗІЦЬ ПА СПАЙС У РАСІЮ...»

ЗА продаж курыльных сумесяў са студзеня збіраюцца караць, як за распаўсюд іншых наркотыкаў. Карэспандэнт «Звязды» высвятляў, што сталася з дзясяткамі інтэрнэт-сайтаў, на якіх прадавалі спайс? І ці ўтаймаваліся аматары курыльных сумесяў, якім таксама пагражае крымінальная адказнасць за ўжыванне?

Больш за год у Беларусі прадаваліся курыльныя мікстэ з лінейкі спайс. Уздзеянне іх на арганізм чалавека падобнае да ўздзеяння марыхуаны. Доўгі час набыць псіхатропнае рэчыва было гэтак жа лёгка, як гарэлку ці цыгарэты. Не дзіўна, што наркотыкі карысталіся шалёнай папулярнасцю. Сумесі прадаваліся легальна, а барыгі (наркагандляры) рэкламавалі іх на сотнях інтэрнэт-сайтаў.

І толькі з 1 студзеня 2010 года кампаненты «спайса» трапілі ў пералік асабліва небяспечных наркатычных рэчываў. Цяпер адказнасць за распаўсюд — да 15 гадоў пазбаўлення волі, за ўжыванне — да пяці гадоў пазбаўлення волі.

Адразу пасля навагодніх святаў карэспандэнт «Звязды» зайшоў на інтэрнэт-старонкі, дзе яшчэ месяц таму свабодна прадаваліся наркотыкі ў каляровых пакеціках. Яшчэ тады гандляры прапаноўвалі калядныя зніжкі на свае сумесі. Ды пазначаныя на сайтах беларускія нумары тэлефонаў пасля Новага года адключылі. Адказалі толькі аднойчы:

— Не! Я нічога не прадаю.

— На інтэрнэт-старонцы пазначаны ваш тэлефон. Цытую аб'яву пра вашы сумесі: «У старажытных пісьмовых крыніцах можна сустрэць тэксты пра выкарыстанне раслінаў у якасці крыніцаў харчавання, для лячэння хваробаў і гэтак далей». Хачу купіць.

— Не-не! Вы памыліліся! — запэўніў голас і тут жа адключыў слухаўку.

Адзін з ужывальнікаў «спайсу», на якога карэспандэнт «Звязды» выйшаў у час падрыхтоўкі мінулых артыкулаў, распавёў, што барыгі, баючыся пакарання, прадаюць сёння сумесі толькі праверанымі людзям. А збольшага гандляры адмовілася ад небяспечнага промыслу.

— Гандляры будуць адказваць па Крымінальным кодэксе, таму ўсе аб'явы з інтэрнэту знікнуць, — яшчэ ўвосень выказаў меркаванне карэспандэнту «Звязды» старшы оперупаўнаважаны па асабліва важных справах ГУУС Мінгарвыканкама Ігар Луневіч. — *Спайс, хутчэй за ўсё, будзе рэалізоўвацца падпольна, як і іншыя наркотыкі.*

Інтэрнэт-групы беларускіх аматараў спайсу дагэтуль функцыянуюць на сацыяльных сайтах. Удзельнікі скардзяцца, што пасля Новага года купіць курыльную сумесь стала амаль немагчыма. І вельмі абураюцца з гэтай нагоды:

«Гэта «развод» для дэбілаў. Шкада, што забаранілі з 1 студзеня, але ўсё роўна будзем курыць!»

«Я не доктар, але скажу з упэўненасцю, што ад спіртнога шкоды куды больш. Цяпер прыйдзецца ездзіць па спайс у Расію, мяжы ж няма, — выказвае ідэю іншы ўдзельнік інтэрнэт-групы.

Як высветліў карэспандэнт «Звязды», у суседняй Расіі спайс і сапраўды дагэтуль бесперашкодна прадаецца праз інтэрнэт. За секунды знаходзім аб'яву аб продажы курыльных сумесяў у расійскім Смаленску (300 кіламетраў ад Мінска, менш за гадзіну язды на машыне ад беларускай мяжы).

— Мінімальная колькасць тавару, якую можам адпусціць, 100 грамаў (100 пакеціку). — «Звязда»), — прапанавалі нам па тэлефоне. — *Кошт 14 000 расійскіх рублёў (485 долараў ЗША). Чым большыя аб'ёмы, тым меншы кошт. Адзінае, што працуем з Масквы. У Мінск высылаць не можам, пасылкі правяраюцца. Таму прыязджайце.*

Як бачна, прадпрымальным барыгам нескладана працягваць спайсавы наркатрафік на тэрыторыю Беларусі. А ці магчыма будзе гэты трафік спыніць, залежыць ад праваахоўных органаў.

Яўген ВАЛОШЫН.

Інтэрнэт-групы беларускіх аматараў спайсу дагэтуль функцыянуюць на сацыяльных сайтах. Удзельнікі скардзяцца, што пасля Новага года купіць курыльную сумесь стала амаль немагчыма.

Адзін з ужывальнікаў «спайсу», на якога карэспандэнт «Звязды» выйшаў у час падрыхтоўкі мінулых артыкулаў, распавёў, што барыгі, баючыся пакарання, прадаюць сёння сумесі толькі праверанымі людзям. А збольшага гандляры адмовіліся ад небяспечнага промыслу.

ЦІ МАГЧЫМА НОВАЕ НАШЭСЦЕ «СІНТЭТЫЧНЫХ» НАРКОТЫКАЎ У БЕЛАРУСЬ?

Наша заканадаўства не змагло аператыўна адрэагаваць на з'яўленне курыльных сумесяў. Больш за год спайс прадаваўся ў нас на кожным кроку. За гэты час небяспечнае рэчыва паспыталі дзясяткі і сотні тысяч маладых. Медыкі папярэджвалі, што мікстэ выклікаюць псіхалагічную і нават фізічную залежнасць. «Звязда» распавядала гісторыю мінскага праграміста Максіма Сакалоўскага, які, пакурыўшы спайс, патрапіў у псіхіятрычную клініку («У Беларусі легальна прадаюцца наркотыкі?», нумар за 3 кастрычніка 2009 года).

«Курыльная сумесь руйнуе галаўны мозг, уплывае на дыханне, прыводзіць да прыдуркаватасці,* — аналізаваў журналістам загадчык сектара наркалогіі «Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя» Уладзімір Максімчук. — *Спайс выклікае звычку, чалавек патрапляе ў палон адчуванняў».

Медыкі і праваахоўнікі разумелі сітуацыю задоўга да ўключэння курыцельных сумесяў у пералік псіхатропных сродкаў. І за той час, пакуль ішла бюракратычная цяганіна, Беларусь, перакананы, атрымала сакрушальную шкоду.

Няўжо, калі ў наркалабараторыях вынайдуць новыя небяспечныя сінтэтычныя рэчывы, нам давядзецца зноўку больш за год чакаць, пакуль іх уключаць у пералік?